Міжнароднае грамадскае аб’яднанне
«Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»

Сэрыя «Бібліятэка Бацькаўшчыны»
Кніга I

Месца выданьня — Парыж
Выбраныя старонкі часопіса «Моладзь» (1948—1954)

Менск
«Беларускі кнігазбор»
2004

УДК 821.161.3-054.72-3
ББК 84 (4 Беи) -44
М 53

Сэрыя заснавана ў 2004 годзе

Укладальнік
Міхась Скобла

Прадмова
Міхася Наўмовіча

МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» выказвае шчырую падзяку сп. **Міхасю Наўмовічу** (Парыж) за чынны ўдзел у падрыхтоўцы кнігі і фундаваньне выданьня, а таксама сп. **Аўгену Калубовічу** (Менск) за прадастаўленыя матэрыялы.

М 53 **Месца выданьня — Парыж:** Выбр. старонкі часоп. «Моладзь» (1948—1954) / Уклад. М. Скоблы; Прадм. М. Наўмовіча. — Мн., «Беларускі кнігазбор», 2004. — 444 с. [8] с.: іл. — (Сэр. «Бібліятэка Бацькаўшчыны»: Кн. I)
ISBN 985-6730-39-2.

Кнігу склалі выбраныя старонкі часопіса «Моладзь», які выдавалі маладыя беларусы ў Парыжы ў 1948—1954 гадах. Цікавыя асобы, унікальныя матэрыялы, невядомыя факты з жыцьця паваеннай хвалі эміграцыі... У разьдзеле «Дадатак» — лісты, дакумэнты, успаміны аднаго са стваральнікаў «Моладзі» М. Наўмовіча.

Гэтай кнігай запачаткоўваецца выдавецкая сэрыя «Бібліятэка Бацькаўшчыны».

УДК 821.161.3-054.72-3
ББК 84 (4 Беи) -44

© Скобла М., укладанне, 2004
© Наўмовіч М., прадмова, 2004
© МГА «ЗБС «Бацькаўшчына», 2004

ISBN 985-6730-39-2

ГАРТАЮЧЫ БАЧЫНЫ ПАМЯЦІ

Гэта было даўно, больш за паўстагодзьдзя таму назад, а ў маёй памяці астаўся такі моцны сьлед прамінулых падзей, быццам яны адбыліся ўчора.

У 1948 годзе беларусы, расьцярушаныя вайной па Эўропе, зьяжджаліся ў Францыю: хто зь Нямеччыны, куды быў вывезены акупацыйнымі ўладамі на прымусовыя працы, хто зь іншых краінаў, хто звальняўся з працы пры амэрыканскім войску. Маладых, 20—25-цігадовых хлопцаў прыцягваў заходні сьвет.

Гартаючы бачыны памяці, прыгадваю беларусаў, што жылі на той час у Парыжы, тыя беларускія асяродкі, што месьціліся ў французкай сталіцы. Найбольш ахвярны, адданы беларускай справе ды ініцыятыўны быў Уладзімер Шыманец. Ён стварыў маленькую друкарню, належаў да ўсіх беларускіх суполак, што пачалі тварыцца ў Францыі, быў сябрам шматлікіх міжнародных арганізацыяў. Ён дапамагаў пры неабходнасьці ўсім беларусам — парадамі, працаю й г.д. Ня трэба забывацца, што ў яго сям'і вырасла Івонка Сурвілла, што сяньня ёсьць Старшынёй Рады БНР, якая так інтэлігентна, так ахвярна змагаецца за правы чалавека, волю ды шчасьлівейшы быт нашае дарагое Беларусі.

У Парыжы я запазнаўся з Валяй Міцурай, якая была вывезеная з усходняе Беларусі на прымусовыя працы ў Нямеччыну. Яна сталася жонкай пісьменьніка Аўгена Кавалеўскага.

У цэнтры Парыжу жыў Лявон Рыдлеўскі, ён жа адшукаў на поўначы французкай сталіцы, у St. Ouen, нейкі стары гатэль, запушчаны, з мноствам пакояў і старым сымпатычным гаспадаром. У гатэлі часова жылі Янка Філістовіч, Арсень Монід, Высоцкі, Хоміч, Дубоўскі, Сьпічонак, Бут-Гусаім (беларускі татарын аднекуль з-пад Вялейкі) ды іншыя хлапцы. Мяне Філістовіч таксама запрасіў пажыць у St. Ouen. Што праўда, на кароткі час, бо пакой быў вузенькі, другога ложка няможна было паставіць, даводзілася ўночы стукаць локцем пад рэбры свайму суседу.

За пару гадоў беларускае «гняздо» ў St. Ouen амаль расьсялілася.

Беларусы жылі ды гуртаваліся і ў правінцыях Францыі: на поўначы вакол былых вугальных капальняў каля Danais, Roubaix, Calais, на ўсходзе вакол жалезных капальняў у Латарынгіі, у цэнтральнай Францыі паблізу Creusot, дзе выпускалі зброю, будаўнічыя матэрыялы ды розныя машыны для прыватнага й вясковага карыстаньня. У апошнім асяродку я часта бываў і меў там сымпатычных прыяцеляў, шчырых беларусаў.

Прыехаў у Парыж і наш вялікі сьвятар айцец Леў Гарошка, якога ўсе шанавалі й любілі. Ён вянчаў маладых і хрысьціў іхніх дзяцей, кожную нядзелю адпраўляў багаслужбу. Пасьля імшы ён раздаваў усім, хто меў патрэбу, розныя прадукты, якія прысылалі ў Эўропу, паводле пляну Маршала, амэрыканцы. Прысылалі яны й вопратку ў добрым стане, часамі нават новую. Студэнтам давалі невялікія стыпендыі.

Неабходна адцеміць, што IRO (міжнародная арганізацыя ў справах эмігрантаў) бараніла нас перад французкай адміністрацыяй, і мы захоўвалі сваю беларускую нацыянальнасьць. Маральна гэта мела вялікае значэньне. Калі IRO зачынілі, то бараніць нас не было каму, і французы часам змушалі людзей запісвацца палякамі альбо расейцамі.

Мы з айцом Львом Гарошкам, як маглі, змагаліся супраць падобных фальсыфікацыяў. Спатыкаліся з сэнатарамі, пісалі да 1-га Міністра і ў некаторых выпадках вярнулі нацыянальнасьць.

А цяпер пра сам часапіс «Моладзь». Ён быў заснаваны ў 1948 годзе ў Парыжы, дзякуючы высілкам Янкі Філістовіча й аўтара гэтых радкоў. Душою й маторам праекту быў Філістовіч. Ён і зрабіў усе неабходныя захады перад французкімі ўладамі, каб атрымаць дазвол на заснаваньне арганізацыі «Беларуская незалежніцкая моладзь у Францыі», органам якой і быў часапіс. Філістовіч пісаў для яго ўступныя артыкулы й гістарычныя нарысы. У адным зь першых нумароў «Моладзі» Янка Філістовіч зазначаў: «Сяньня, у 28-я ўгодкі Слуцкага паўстаньня, мы, беларусы-выгнанцы, пераносімся сэрцам і думкаю на патаптаныя чужынцамі магілы слуцкіх змагароў, клянемся ў помсьце і кажам: «Слава й вечная памяць слуцкім паўстанцам, паўшым за родны край — Беларусь!» У наступным нумары, пішучы пра пошукі старажытнага Менску, Філістовіч даводзіў: ''Кожны зь беларусаў, асабліва мы, моладзь, павінны сьмела глядзець наперад, ведаючы, што нас чакаюць у будучыні лепшыя пэрспэктывы. Дык працуйма для Бацькаўшчыны й яе народу!» Такіх цытатаў можна было б прывесьці шмат, і ўсе яны засьведчылі б, якую аграмадную любоў да Беларусі й яе народу насіў у сваім сэрцы Янка Філістовіч.

У часе халоднае вайны 50-х гадоў паміж Савецкім Саюзам і Захадам, калі Сталін наважваўся кінуць свае грабежніцкія сілы на Заходнюю Эўропу, на Захадзе пад кіраўніцтвам Злучаных Штатаў Амэрыкі патварыліся камітэты, якія падрыхтоўвалі сьвет да абароны. Янка Філістовіч выкарыстаў гэты момант, каб вылецець на Беларусь, дзе ён мроіў стварыць партызанскі рух, каб вызваліць Беларусь ад бальшавіцкіх акупантаў. Ад 1950 году яго пяро заміраe на бачынах «Моладзі».

Пішу гэтыя радкі, і мне сэрца баліць, калі ўспамінаю вернага сябра, бясконца адданага беларускаму вызвольнаму руху маладога патрыёта, які змог бы шмат прынясьці карысьці Беларусі.

У БССР выйшла кніжка «На воўчых сьцежках», дзе дакладна апісаныя пошукі ў лясох ды арышт Янкі Філістовіча. Некалькі экзэмпляраў спэцыяльна прыслалі ў Францыю. Цяжка дапусьціць, каб саветы ашчадзілі жыцьцё Філістовіча, бо такіх людзей бальшавіцкая машына сьмерці бязьлітасна нішчыла.

Пасьля адыходу Янкі Філістовіча галоўную працу па выданьні часапісу давялося пераняць мне. Была створаная маленькая рэдкалегія, у яе ўвайшлі некалькі адданых супрацоўнікаў, у іх ліку Аўген Кавалеўскі, які рэгулярна даваў у часапіс разьдзелы свае аповесьці «Людзі ў полымі», часам пісаў фэльетоны.

Але асабліва вялікі ўклад у стварэньне «Моладзі» ўнёс архімандрыт Леў Гарошка, з-пад пяра якога выйшлі цудоўныя апавяданьні пра красу Беларусі, пра багацьце яе мовы й г.д. Вельмі шырокая веда ва ўсіх галінах жыцьця, аграмаднейшая культура архімандрыта Гарошкі сапраўды ўзбагацілі выданьне.

Зь цягам часу аўтараў у «Моладзі» пабольшала. Патлумачу тут некалькі псэўданімаў і крыптанімаў. *Міхась Смага, М.С., Сябра Міхась, Н.М., М.Н.* — гэтак падпісваў матэрыялы аўтар гэтых радкоў; *Л. Іскра* (і, здаецца, *Наваградчанін*) — так называў сябе айцец Л. Гарошка; *Янка Воўк, Я. Люціч-Воўк* — гэта псэўданімы Я. Філістовіча; *Ніна Раса* — Ніна Абрамчык. На жаль, прыналежнасць іншых псэўданімаў устанавіць не бяруся, многае сьцерлася з памяці.

Нягледзячы на скромны выгляд часапісу, рататарны друк, ён карыстаўся вялікім посьпехам паміж беларусаў, параскіданых па ўсіх кутках сьвету. Трэба дадаць, што, пачынаючы ад 7-га нумару, часапіс атрымаў друкаваную каляровую вокладку з назовам па-беларуску й па-французку. У цэнтры яе месьціўся беларускі герб Пагоня, а зьнізу — урывак зь вершу А. Зязюлі:

Над гонар і славу, над чары каханьня,
Народную справу й перакананьне,
Што розум дыктуе, заўсёды я волю —
Ня здраджу ніколі.

Для першых бачынаў часопісу я рабіў малюнкі; далей ішлі тэксты й ноты беларускіх песьняў; затым — артыкулы патрыятычнага зьместу, тэматычна зьвязаныя з найважнейшымі гістарычнымі падзеямі на Беларусі. Рэгулярна падаваліся справаздачы пра дзейнасьць БНАМ (Беларускай незалежніцкай арганізацыі моладзі), пра яе зьезды. Так з 18-га нумару мы даведваемся, што галоўная Управа арганізацыі была пашыраная да 9-ці асобаў. Сяньня, перачытваючы іх прозьвішчы, прыгадваю, што большая палавіна пераехала пазьней за межы Францыі, пераважна ў краіны Паўночнай Амэрыкі. З чым і было зьвязана паступовае адміраньне арганізацыі на тэрыторыі Францыі, хоць гэта не адзіная прычына; найбольш важнай прычынай быў той факт, што заходнія краі-

ны Эўропы, асабліва Францыя, прыступілі да больш цеснага супрацоўніцтва з бальшавізмам. Гэтае супрацоўніцтва, эканамічнае, тэхнічнае, культурнае нічога карыснага Захаду не прынесла, зь яго карысталі толькі бальшавікі, атрымоўваючы ад заходніх краінаў вялікую тэхнічную дапамогу ды за бясцэнак — збожжа, мяса, масла, бульбу ды іншыя неабходныя прадукты. Такім чынам Захад ратаваў ад эканамічнае сьмерці бальшавіцкую маскоўскую імпэрыю. Супрацоўніцтва Францыі з бальшавікамі, распачатае генэралам дэ Голем, не магло ісьці на карысьць усім эміграцыйным асяродкам з цэнтральнае і ўсходняе Эўропы, у тым ліку й асяродка беларускага.

У часапісе «Моладзь» чытач знаходзіў усю інфармацыю адносна жыцьця й дзейнасьці БНАМ, эканамічнага й духовага стану беларускага народу. Паведамленьні адносна Беларусі чэрпаліся часткова з савецкае прэсы, а пераважна з успамінаў беларускіх патрыётаў. Быў у часапісе маленькі куток мовы, дзе чытач знаходзіў характэрныя нарысы пра беларускую мову ды яе вырозьненьні ў параўнаньні зь некаторымі славянскімі мовамі, у першую чаргу з польскаю ды расейскаю. Друкаваліся апавяданьні аб прыродзе Беларусі, аб яе лясных багацьцях, аб разнастайным і багатым жывёльным сьвеце. Зьмяшчаліся таксама інфармацыі адносна найважнейшых навуковых і тэхнічных пошукаў чалавецтва апошніх гадоў, прыкладам, атамнае энэргіі й г.д. Існаваў куток спорту, увогуле публікавалася ўся інфармацыя адносна жыцьця беларускае калёніі ў Францыі, вёўся разьдзел гумару.

Фінансаваньне часапісу апіралася на сяброўскіх складках і ахвярах, але найбольшыя ўклады панясьлі мы з Янкам Філістовічам, вялікая частка нашых стыпэндый адыходзіла на «Моладзь».

Зь цягам часу беларуская моладзь пастарэла, многія сябры, шукаючы лепшых энамічных умоваў для жыцьця, павыяжджалі з Францыі ў іншыя краіны вольнага сьвету, пераважна ў Злучаныя Штаты Амэрыкі й Канаду, а маленькая група, што засталася ў Францыі, ня мела сілы прадаўжаць выданьне часапісу. «Моладзь» паяўлялася штораз радзей і нарэшце канчаткова зьнікла.

Шкада, што так сталася, але ж сьлед, які пакінуў часапіс за сабою, ёсьць цікавай бачынкай беларускага вызвольнага друку. Нам, былым выдаўцам і прыхільнікам часапісу, было вельмі прыемна, калі адзін з заснавальнікаў Бібліятэкі й Музэю імя Францішка Скарыны ў Лёндане, яго Эксцэленцыя візытатар беларусаў-каталікоў Уладыка Часлаў Сіповіч, загадаўшы аправіць у дарагую скураную вокладку поўны камплект выданьня «Моладзі», сказаў: «Гэта адно з нашых найбольш сымпатычных і цэнных выданьняў».

Міхась НАЎМОВІЧ